**8.** Паслухайце паэму Янкі Купалы «Бандароўна» і падрыхтуйцеся да выразнага чытання твора па асобах.

**9.** Знайдзіце ў творы завязку, кульмінацыю і развязку. Ці ёсць у паэме пралог і эпілог? Размясціце цытаты з паэмы ў адпаведнасці з развіццём сюжэта (трэнажор па паэме Янкі Купалы «Бандароўна»).

***Тэорыя літаратуры***

## Жанры лірыкі

***Жанр літаратурны*** (фр. *genre* — 'род, від') — тып мастацкага твора ў адзінстве зместу і формы з уласцівымі толькі яму сэнсавымі і стылістычнымі прыметамі.

Паводле змястоўнай сутнасці акрэсліваюцца жанры **грамадзянскай, пейзажнай, філасофскай, інтымнай** лірыкі. У кожным з гэтых жанраў можна вылучыць і асобныя жанравыя разнавіднасці. З другога боку, жорсткай мяжы паміж некаторымі жанрамі не існуе. Так, вершы Янкі Купалы «Малітва», «Роднае слова» адносяцца да грамадзянскай лірыкі патрыятычнай разнавіднасці. Верш «Жняя», у якім услаўляецца знешняя прыгажосць, фізічная дасканаласць і працавітасць беларускай дзяўчыны, арганічна ўваходзіць у жанр інтымнай лірыкі. Да таго самага жанру, толькі ўжо любоўнай яго разнавіднасці, належыць і верш «Явар і каліна». Пры гэтым яго можна аднесці і да жанру пейзажнай лірыкі. Аднак да якога жанру ці жанравай разнавіднасці ні належалі б лірычныя творы, іх усе аб'ядноўвае якасць, якую ўмоўна можна назваць лірычнасцю. Яна, лірычнасць, увасабляецца ў асобым характары паэтычнага выказвання, у лексіцы, тропіцы, сінтаксісе, у рытміка-інтанацыйным ладзе, гукапісе вершаў, іх выразнай меладычнасці, музычнасці. Не дзіва, што кампазітары часта ствараюць песні менавіта на лірычныя тэксты. Так, шырока вядомымі сталі песні на словы Янкі Купалы: «Явар і каліна» (музыка Ю. Семянякі), «Малітва» (музыка А. Молчана), «Жняя» (музыка А. Багатырова) і інш.

**1.** Што вызначае жанр мастацкага твора?
**2.** Якія жанры лірыкі існуюць?
**3.** Раскажыце пра ўзаемапранікненне лірычных жанраў.



Правообладатель Национальный институт образования